Распачаў служэнне Гродзенскі капітул

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
29.05.2016 00:00



У свята Езуса Хрыста, Найвышэйшага і Вечнага Святара, адбылася ўрачыстая інсталяцыя Гродзенскага катэдральнага капітула Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Казіміра. У яго склад увайшлі 17 канонікаў, сярод якіх 8 грэміяльных і 9 ганаровых. Інсталяцыя капітула

Абрад інсталяцыі катэдральнага капітула быў здзейснены ў касцёле св. Францішка Ксаверыя падчас святой Імшы, цэлебраванай ксяндзамі біскупамі Аляксандрам Кашкевічам і Юзафам Станеўскім. Спачатку канонікі зачыталі Апостальскі сімвал веры, узгадваючы абавязак вызнавання веры згодна з вучэннем Касцёла. Затым, ускладваючы рукі на Святое Пісанне, склалі прысягу вернасці.

Наступнай часткай інсталяцыі было асвячэнне кананічных знакаў годнасці. Ксёндз біскуп Аляксандр Кашкевіч урачыста ўсклаў іх на грэміяльных канонікаў. Элементам абраду інсталяцыі было займанне канонікамі сваіх месцаў у лавах катэдральнай базілікі.

Напрыканцы інсталяцыі выступіў дэкан капітула ксёндз Генрых Яблоньскі. Ён падзякаваў біскупу за аказаны давер да выбраных святароў і звярнуў увагу прысутных на тое, што “гэта не толькі адрозненне, але і абавязацельства”. Дэкан капітула назваў прызначаных канонікаў “апекунамі цудоўнай традыцыі” і паабяцаў ад імя ўсіх членаў капітула годна служыць Богу, Касцёлу і біскупу.

На заканчэнне святой Імшы ардынарый Гродзенскай дыяцэзіі ксёндз біскуп Аляксандр Кашкевіч удзяліў пастарскае бласлаўленне вернікам, якія прыйшлі раздзяліць радасць інсталяцыі капітула.†

Гродзенскі капітул з’яўляецца калегіяй духавенства, якая існуе пры біскупе як дара

Грэміяльныя канонікі:

Кс. Генрых Яблоньскі (дэкан капітула)
Кс. Ян Кучынскі (цырымоніймайстар)
Кс. Уладзімір Гуляй (тэолаг)
Кс. Юзаф Багдзевіч (кусташ)
Кс. Антоній Грэмза (сакратар)
Кс. Цэзарый Міх (пэнітэнцыярый)
Кс. Рычард Якубец
Кс. Ян Пузына

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
29.05.2016 00:00

Ганаровыя канонікі:

Кс. Юзаф Ханьчыц
Кс. Чэслаў Паўлюкевіч
Кс. Ян Пецюн
Кс. Станіслаў Пацына
Кс. Алег Дуль
Кс. Аляксандр Сасноўскі
Кс. Віктар Велівіс
Кс. Людвік Станішэўскі
Кс. Люцыян Радомскі



Роля капітула ў дыяцэзіі

Капітул – гэта група святароў, т. зв. канонікаў, якія ўтвараюць сенат біскупа. Згодна з Кодэксам кананічнага права, задачай капітула з'яўляецца правядзенне найбольш урачыстых літургічных падзей у катэдральным або калегіяльным касцёле. Гэты старажытны прававы інстытут увасабляе клопат Касцёла аб справах культу і падтрымлівае біскупскую адміністрацыю ў якасці сената і рады.

Тытул каноніка святары атрымліваюць пажыццёва ў знак падзякі за заслугі перад Касцёлам. Грэміяльныя канонікі (у адрозненні ад ганаровых) надзяляюцца пэўнымі правамі і абавяз- камі. І толькі грэміяльныя канонікі маюць права актыўнага і пасіўнага голасу на сходах капітула ў якасці кансультатыўнага органа біскупа.

Права на заснаванне капітула дае Святы Пасад. Унутраную структуру і статут распрацоўвае дыяцэзіяльны біскуп. На сённяшні дзень катэдральны капітул існуе ў Віцебску, раней існаваў у Магілёве і Мінску.


Гродзенскі катэдральны капітул Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Казіміра быў заснаваны паводле норм кананічнага права са згоды Апостальскай Сталіцы ў 2012 годзе. У сакавіку бягучага года ў будынку гродзенскай курыі ксёндз біскуп Аляксандр Кашкевіч агучыў прозвішчы святароў, якіх прызначыў канонікамі, і ўручыў ім дэкрэты. У маі ж адбылася ўрачыстая інсталяцыя.

Назва капітула як бы спалучана з дзвюх частак: першая спасылаецца на тытул старэйшага на нашых землях касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі (Фара Вітаўта), другая – на заступніка дыяцэзіі святога Казіміра Каралевіча.

Капітул клапоціцца аб правільным і згодным з літургічнымі нормамі адпраўленні набажэнстваў.

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
29.05.2016 00:00

“Адной з нашых задач з’яўляецца распаўсюджванне культу Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі, тытул якога мае капітул,– падкрэслівае дэкан капітула ксёндз Генрых Яблоньскі. – Таксама мы будзем працаваць над прэзентацыяй і распаўсюджваннем у дыяцэзіі дакументаў Святога Пасада”.



Правы і абавязкі канонікаў

Абавязкі канонікаў акрэслівае Кодэкс кананічнага права, статут Гродзенскага катэдральнага капітула, а таксама дыяцэзіяльны біскуп.

Канонікі павінны ўдзельнічаць у літургічных працэсіях у час святых дзён літургічнага года. Статуты абавязваюць іх ужываць аднолькавыя харавыя ўборы, рэгулярна адпраўляць Імшу пад кіраўніцтвам біскупа, клапаціцца аб якасці літургічных прылад і, урэшце, дбаць пра матэрыяльную аснову Божага культу.

Згодна з артыкулам 28 статута Гродзенскага катэдральнага капітула Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі і святога Казіміра, члены капітула павінны прымаць удзел у агульнадыяцэзіяльных набажэнствах, якія ўзначальвае гродзенскі біскуп у катэдральнай базіліцы і ў іншых касцёлах дыяцэзіі. Канонікі, якія служаць не на тэрыторыі біскупскага горада, удзельнічаюць у набажэнствах, калі ім дазваляюць душпастарскія абавязкі ва ўласных парафіях.

Асноўным абавязкам членаў капітула з’яўляецца згоднае з ідэаламі святарскай дасканаласці жыццё праз бесперапыннае паглыбленне хрысціянскай, інтэлектуальнай, духоўнай і пастарскай фармацыі.

Распачаў служэнне Гродзенскі капітул

Аўтар: Ангеліна Пакачайла
29.05.2016 00:00

